УДК 595.44:502.743

**У. У. Іваноў, А. В. Прышчэпчык**
Дзяржаўнае навукова-вытворчае аб'яднянне «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах», Мінск

# ПАВУКІ ДАЛАМЕДАСЫ (DOLOMEDES PLANTARIUS I D. FIMBRIATUS) НА ТЭРЫТОРЫІ НІЗІННАГА БАЛОТА «ЗВАНЕЦ»

**Уводзіны.** У нашых папярэдніх тэзісах дадзены агляд знаходак рэдкага віду павука *Dolomedes plantarius* (Clerck, 1757) на Беларусі па сітуацыі на 2012 год [1, с. 86—87]. У нашай працы мы больш шырока раскрываем звесткі пра яго, а таксама звяртаем увагу на суіснаванне вялікага сплаўнога павука і аблямаванага паляўнічага (*Dolomedes fimbriatus* (Clerck, 1757)) у межах аднаго біятопа.

Яшчэ 20 год таму лічылася, што два віды даламедасаў не могуць суіснаваць у межах аднаго біятопу, бо яны выцясняюць адзін аднаго [2, с. 63]. Таксама абмежавальнымі фактарамі выступалі абіятычныя фактары (як сонечная экспазыцыя) і біятычныя фактары (як тып расліннасці). Аднак з таго часу з'явіліся звесткі пра біятопы, дзе абодва павука могуць быць знойдзены разам [3, с. 53]. Аўтары ўказваюць на тры кропкі ў Чэшскай Рэспубліцы. Наяўнасць двух відаў у межах аднаго біятопу яны тлумачаць паступовай градацыяй тыпу біятопа ад балотнага да сажалкі, прычым да балотнага болей належаў *D. fimbriatus*, а да сажалкі — рэдкі вялікі сплаўны павук *D. plantarius*.

**Асноўная частка.** Ў перыяд з чэрвеня па жнівень 2014 года намі былі праведзены даследванні на тэрыторыі нізіннага балота «Званец». За гэты час былі абследваны тры стацыянары на балоце, (1-ы і 2-і — на поўдні, і 3-ці — на поўначы) (рысунак 1), з выкарыстаннем кашэння, пастак Барбэра (стакан 500 мл з 4%-м растворам фармаліна) і ручнога збору. Таксама праводзіўся якасны збор матарыялу з дапамогай сачка і ўручную на тэрыторыях, прылягаючых да стацыянарных кропак. Павукі захоўваліся ў 70%-м этаноле.

Вынікам сталі знаходкі *D. plantarius* і *D. fimbriatus* практычна на ўсёй даследаванай тэрыторыі, акрамя стацыянара № 2 (табліца 1).

Цікавым з'яўляецца той факт, што ў дадзеным выпадку мы не здолелі прасачыць нейкія заканамернасці размеркавання гэтых двух відаў у залежнасці ад градацый у межах мікрабіятопаў. На дадзены момант сітуацыя прадстаўляецца такім чынам, што абодва віды могуць сустракацца на ўсёй працягласці балота, незалежна ад ступені затаплення або тыпу расліннасці. Так, на поўдні балота ступень затаплення значна большая




*1* — маніторынгавы пункт «Павіцце»; *2* — пункт «Рожнае»; *3* — пункт «Навасёлкі»;
- - - - — маніторынгавы маршрут

Рысунак 1 — Схема размяшчэння маніторынгавых пунктаў у 2014 годзе на балоце Званец Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці

Т а б л і ц а 1 — Павукі рода Dolomedes на нізінным балоце «Званец»

| Дата | Месца | Спосаб адлову | D. plantarius, колькасць і пол | D. fimbriatus, колькасць і пол |
|---|---|---|---|---|
| 05.06.2014 | Стацыянар № 1 | Ручны збор | 1♀ | — |
| 19.06.2014 | Стацыянар № 1 | Ручны збор | 1♀ | — |
| 30.06.2014 | Стацыянар № 1 | Ручны збор | — | 1♀ |
| 25.07.2014 | Стацыянар № 1 | Пасткі Барбэра | 3♂ | 1♀ |
| 25.07.2014 | Наваколле стацыянара № 3, затопленая дарога | Ручны збор | 3♀ | — |
| 18.08.2014 | Стацыянар № 3 | Кашэнне | 1♀ | 1♀ |

(глыбіня магла дасягаць 1 м), а з раслін пераважае чарот. На поўначы, наадварот, глыбіня не пераважала 30 см, а з раслін дамінуе асака. Прычым узровень вады змяняўся на працягу даследванняў, і у канцы ліпеня на поўдні вада практычна адсутнічала. Абодва віды, як мы бачым, сустракаліся і на поўначы, і на поўдні. Відавочна, што колькасць



Репозиторий БарГУ

*D. plantarius* некалькі большая, чым *D. fimbriatus*. Аднак зладзіць паўнавартасны колькасны аналіз на дадзены момант немагчыма, бо спосабы адлову, якія аказаліся эфектыўнымі, у асноўным прадстаўлены якаснымі мэтадамі збору (ручны збор). Увогуле балота «Званец» па сукупнасці характарыстык больш прыдатнае для вялікага сплаўнога павука (адкрытыя, добра праграваемыя тэрыторыі, наяўнасць адкрытых водных прастораў), чым для аблямаванага паляўнічага (*D. fimbriatus*), хоць апошні від з'яўляецца больш экалагічна пластычным.

Заўжды, калі гаворка ідзе пра два віды даламедасаў, паўстаюць пытанні пра дакладнасць ідэнтыфікацыі, бо яны надта падобныя звонку адзін да аднаго, і дакладным адрозненнем між імі можа служыць толькі будова геніталій. Так, згодна вызначальніку [4], які акумуляваў дадзеныя з розных спэцыялізаваных выданняў, самцы розняцца будовай тыбіяльнага атожылка, які ў *D. plantarius* тупы і з выемкамі, а ў *D. fimbriatus* — загостраны і ніколі не бывае з выемкамі (рысункі 2 і 3). Адрозненні эмбалюся і базальнага бульбарнага атожылка заўважыць значна цяжэй, і яны ўяўляюцца менш дакладнымі прыкметамі.

У самак *D. plantarius* эпігіна заўжды без аваласнення і антэрыяльна — са светлай і бліскучай пластінкай, а пастэрыяльна — з моцна склератызаванай. У самак *D. fimbriatus* эпігіна цёмная, пакрыта валаскамі, і магчыма заўважыць толькі дзьве светлыя плямы размешчаныя антэрыяльна (рысункі 4 і 5). Мы прыводзім свае фатаздымкі і рысунак па

Репозиторий БарГУ



Рысунак 2 — Педыпальпа з тыбіяльным атожылкам самца *D. plantarius* (Clerck,1757), адлоўленага на стацыянары № 1 25.07.2014



Рысунак 3 — Педыпальпа з тыбіяльным атожылкам самца *D. fimbriatus* (Clerck, 1757), па Roberts, 1995 [4]



Рысунак 4 — Эпігіна самкі *D. plan-tarius* (Clerck, 1757), адлоўленай каля стацыянара № 3 на затопленай дарозе



Рысунак 5 — Эпігіна самкі *D. fimbriatus* (Clerck, 1757), адлоўленай на стацыянары № 1

Roberts, 1995, з вышэй азначанага вызначальніка [4]. Раней выявы палавых прыдаткаў даламедасаў з тэрыторыі Беларусі прыводзіліся толькі у працы А. Саварына і А. Астроўскага [5, с. 57].

**Заключэнне.** Беларусь можа стаць краінай, дзе знаходзіцца адна з найвялікшых папуляцый *Dolomedes plantarius* у Еўропе. Гэта падцвярджаюць і нашы папярэднія даследванні, і бягучыя дадзеныя па знаходжанню вялікага сплаўнога павука ў рэспубліцы. Мы лічым, што задачай спэцыялістаў на дадзены момант з’яўляецца прыцягненне ўвагі да вывучэння рэдкіх безхрабтовых жывёл з боку міжнародных прыродаахоўных фондаў, што дасць падставы да павышэння статусаў ахоўных тэрыторый Беларусі і прыцягне ўвагу замежных і нашых даследчыкаў да пытанняў кіравання прыроднымі рэсурсамі ў краіне.

### Спіс цытуемых крыніц


1. *Іваноў, У. У.* Да вывучэння *Dolomedes plantarius* (Clerck, 1757) у Беларусі / У. У. Іваноў // Актуальные проблемы экологии : материалы VIII науч.-практ. конф. — 2012. — Гродно : ГрГУ им. Янки Купалы. — С. 86—87.
2. *Duffey, E.* The distribution, status and habitats of *Dolomedes fimbtiatus* (Clerck) and *D. plantarius* (Clerck) in Europe / E. Duffey // Proceedings of the 15$^{th}$ European Colloquium of Arachnology. — 1995. — P. 54—65.
3. *Holec, M.* Spiders (Araneae) of the fishpond eulittoral zone / M. Holec // Ecologia. — 2000. — Vol. 19. — Suppl. 4. — P. 51—54.
4. Araneae. Spiders of Europe. Version 08.2014 [Electronic resource] / W. Nentwig, 1998—2014. — Mode of access: http://www.araneae.unibe.ch/specieskey/101/Dolomedes#. — Date of access: 25.07.2014. — Screen heading.


Репозиторий БарГУ